**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2020 г.

У ліпені ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання «Летнее чтение с увлечением». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання «Летнее чтение с увлечением»

***5 ліпеня***

На пасяджэнні аматарскага клуба “Каласок” дзецям быў прапанаваны гістарычны экскурс «Шёл мой край дорогами войны».

*Тэвельская ПБ, 12 чал.*

***12 ліпеня***

На фальклорная палянцы «Старинный шёлк былин и россыпь поговорок» дзеці сустрэліся з добра знаёмымі і любімымі казкамі, загадкамі, лічылкамі, калыханкамі. А завяршылася праграма гульнямі і конкурсамі: «Ах, гэтыя старыя словы», «Знаўцы прыказак», «Загадка – для розуму зарадка».

*Дзівінскі ф-л, 13 чал.*

***18 ліпеня***

Пасяджэнне аматарскага клуба «Почемучки» прайшло ў фармаце экалагічнай вандроўкі «Тайны живой природы». Дзеці даведаліся шмат новага аб раслінах і жывёлах, адказвалі на пытанні віктарыны «Жывое – нежывое». Бібліятэкар зрабіла агляд серыі кніг Трафімава «Рассказы Деда Природоведа».

*Кіселявецкая ПБ, 12 чал.*

***19 ліпеня***

Пазнавальна-забаўляльная праграма «В стране книжных приклюЧТЕНИЙ» сабрала ў бібліятэцы вучняў 4 – 6 класаў. Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах, віктарынах, гульнях і наведалі літаратурнае кафэ «Частуем смачнай кнігай» з тэматычнымі падборкамі на любы густ: дэсерт «Для вясёлых дзяўчынак», мус «Казачны», смузі «Смага прыгод». Напрыканцы пазнаёміліся з літаратурнай выставай «У краіне беларускіх казак» і незвычайнай выставай-чамаданчыкам «Лета, сонца, пляж – якую кнігу ўзяць у багаж?»

*Буховічская ПБ, 18 чал.*

На паляне вясёлых задум «Пачытаем, пагуляем, адпачнем, лета з кнігай правядзем» дзяці ўдзельнічалі у розных віктарынах і гулялі ў літаратурнае лата.

*Залеская ПБ, 17 чал.*

***25 ліпеня***

На ўроку бяспечных паводзін «Чтоб не ссориться с огнем», які прайшоў у бібліятэцы, дзеці ўдзельнічалі ў віктырнах, конкурсах, прысвечаных асцярожнаму абыходжанню з агнём і правілах бяспечных паводзін. Да мерапрыемства падрхтавана выстава-інсталяцыя «Огонь – наш друг, огонь – наш враг».

*Верхалеская ПБ, 17 чал.*

Гульнявая праграмма «Пагуляем, пачытаем, час з карысцю правядзем» сабрала ў бібліятэцы дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Дзеці пабывалі на станцыях «Знаўцы казак», «Адгадай слова», «Хто больш». Завяршылася мерапрыемства аглядам літаратуры з кніжнай выставы «У краіне вечнага лета»

*Навасёлкаўская ПБ, 20 чал.*

**<u>Мерапрыемствы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь</u>**

***5 ліпеня***

Падчас выступлення ЛПГ «Шёл мой край дорогами войны» гучалі вершы ваеннай пары, расказвалася аб баявых буднях франтавікоў нашага краю. Мерапрыемства суправаджалася відэаролікамі. Падрыхтавана кніжная выстава «3 ліпеня – Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь».

*Буховічская ПБ, 12 чал.*

Літаратурны калейдаскоп «Квітней пад сінім небам, Беларусь» у бібліятэцы пачаўся з адкрытага прагляду літаратуры «Неператможная Беларусь». Далей праграма складалася з конкурсу малюнкаў «Роднай краіне прысвячаецца» (пераможца Ганна Аўсяюк), віктарыны для дзяцей «Мой край завецца Беларуссю», відэяпрызентацыі «Дзень незалежнасці», выступлення ЛПГ «Рытм».

*Верхалеская ПБ, 36 чал.*

**<u>Мерапрыемствы да Дня горада Кобрына</u>**

***19 ліпеня***

Літаратурнай праграмай «Рыфмы Кобрыншчыны» адзначылі Дзень горада Кобрына члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо». Сюрпрызам для паэтаў сталі закладкі з іх творамі аб Кобрыне і малой радзіме, выдадзеныя аддзелам бібліятэчнага маркетынгу. На закладках размешчаны QR-код, па якому можна перайсці на старонку літаратурнага клуба на сайце Кобрынскай РЦБС. Яшчэ адным падарункам стала першая літаратурная старонка ў газеце «Кобрин-информ», на якой надрукаваны вершы 9 членаў клуба.

*(Кобрин-информ. 2020. 16 июля. С. 3; Кобрин-информ. 2020. 23 июля. С. 3)*

*ЦБ, 7 чал.*

У рамках 75-годдзя Вялікай Перамогі да Дня горада бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі распрацаваны закладкі-банэры пад назвай «Вуліцы, авеяныя славай: гісторыя Вялікай Айчыннай у назвах вуліц Кобрына» і «Хроніка вызвалення Кобрына». Закладкі змяшчаюць кароткую фактаграфічную інфармацыю і адпаведны QR-код, які дазваляе імгненна зайсці на сайт Кобрынскай РЦБС і атрымаць больш поўную інфармацыю па тэме. *(Кобрин-информ. 2020. 16 июля. С. 19; Кобрынскі веснік. 2020. 18 ліпеня. С. 12)*

*ЦБ*

Былы дырэктар ДУК «Кобрынская РЦБС» Марыя Іванова ў час святкавання Дня горада Кобрына ўзнагароджана ў намінацыі «Мудрасць удзячным нашчадкам».

ЦБ

## Выдавецкая дзейнасць

Бібліёграфы цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавалі прэзентацыйны відэафільм «Працай уславілі край родны». Прэзентацыя, як і выданне біябібліяграфічнага даведніка «Па працы і пашана», з'яўляецца падвядзеннем вынікаў работы над трэцім этапам у межах праекта «Славутыя імёны маёй малой радзімы».

*ЦБ*

Ефціфеева Н. П.
Тэл. 3-85-81